# Фестываль «Кліч Палесся» арганічна ўпішацца ў агульны ўздым эканомікі Палесся

**Фестываль этнакультурных традыцый «Кліч Палесся» арганічна ўпішацца ў агульны ўздым і развіццё эканомікі Палесся, дэманструючы ўсё багацце і ўнікальнасць краю, яго самабытнасць і гісторыка-культурную спадчыну. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на ўрачыстым адкрыцці фестывалю, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Прэм'ер-міністр адзначыў, што дзяржаўная праграма па развіцці Прыпяцкага Палесся на 2010-2015 гады, ініцыяваная і зацверджаная Прэзідэнтам Беларусі, прадугледжвае інвесціраванне ў праекты больш як Br3,8 трлн. Будзе праведзена маштабная работа, якая дасць магчымасць павялічыць прамысловую і сельскагаспадарчую вытворчасць у 1,7-1,8 раза. Рэалізацыя гэтай праграмы дасць магчымасць вывесці на новы ўзровень заработныя платы, стварыць новыя ўмовы працы і новую якасць жыцця мясцовага насельніцтва.

Фестываль этнакультурных традыцый «Кліч Палесся» — гэта не толькі сведчанне вялікай павагі да традыцыйнай культуры беларусаў, але і сведчанне нашага імкнення захаваць спадчыну Палесся ва ўсёй яе шматграннасці, падкрэсліў Сяргей Сідорскі.

На яго думку, унікальнасць прыпяцкага Палесся дае магчымасць выказаць упэўненасць, што фестываль «Кліч Палесся» стане прыкметнай з'явай культурнага жыцця Беларусі. Гэта ўнікальнасць праяўляецца ў тым, што за кошт натуральных геаграфічных умоў, у матэрыяльнай і духоўнай культуры гэтага краю — доўлідстве, фальклоры, дыялектах, народна-прыкладным мастацтве — захаваліся многія рысы, якія бяруць пачатак з глыбокай даўніны. Прэм'ер-міністр выказаў таксама надзею, што «наш фестываль зверне на сябе ўвагу і прадстаўнікоў замежных дзяржаў, паколькі ён садзейнічае развіццю сусветнай культуры і супрацоўніцтву паміж народамі».

На першы адкрыты фестываль этнакультурных традыцый «Кліч Палесся» прыехалі знакамітыя землякі, прадстаўнікі дзяржаўных органаў, замежных дыпламатычных місій, акрэдытаваных у Беларусі. Сёння ў аграгарадку Ляскавічы, дзе праходзіць фестываль, сабралася больш за 500 артыстаў прафесіяналаў і аматараў, а таксама каля 60 майстроў і рамеснікаў, якія прадэманструюць усё багацце талентаў прыпяцкага краю.

**Акцыі**

## ПАКІНЬ УЛАСНАЕ АЎТО ДОМА — ДАДАЙ ГЛЫТОК ЧЫСТАГА ПАВЕТРА

**22 верасня пройдзе міжнародная акцыя «Дзень без аўтамабіля», да якой у 2008 годзе далучылася і Беларусь.**

Згодна з інфармацыяй Міністэрства транспарту і камунікацый, па стану на пачатак года аўтамабільны парк краіны налічваў больш за 3,43 мільёна транспартных сродкаў. Да ўзроўню 2008 года ён павялічыўся больш чым на 156 тысяч. З усяго парка каля 85 працэнтаў прыпадае на аўтамабілі індывідуальных уладальнікаў, і 15 працэнтаў — на арганізацыі. Толькі за мінулы год у Беларусь было ўвезена больш за 174 тысячы аўтатранспартных сродкаў, у тым ліку больш за 77 тысяч — фізічнымі асобамі. З агульнай колькасці ўвезеных аўтамабіляў 11,8 працэнта склалі транспартныя сродкі ўзростам больш за тры гады, 28,1 працэнта — ад трох да сямі гадоў, больш за 60 працэнтаў — старэй за сем гадоў.

А цяпер увага: у сярэднім пры прабегу аўтамабілем у год 15 тысяч кіламетраў ён спальвае больш за 2 тоны паліва і спажывае каля 30 тон паветра. Пры гэтым у атмасферу выкідваецца каля 700 кілаграмаў чаднага газу, 400 кілаграмаў дыяксіду азоту, 230 кілаграмаў вуглевадародаў і іншых забруджвальных рэчываў, агульная колькасць якіх складае больш за 200 найменняў. У маштабах краіны доля транспарту ў сумарных выкідах забруджвальных рэчываў у атмасферу ад усіх крыніц складае 72 працэнты (у гарадах — 65-80 працэнтаў). У сярэднім за дзень у Беларусі за мінулы год выкідвалася з адпрацаванымі газамі каля 3 115 тон забруджвальных рэчываў, у тым ліку па Мінску — больш за 537 тон...

Летась у аналагічнай акцыі бралі ўдзел практычна ўсе гарады Беларусі. Паводле статыстыкі, у гэты дзень на дарогах і ў гарадах назіралася зніжэнне інтэнсіўнасці руху на 10 працэнтаў і больш. Толькі на дарогах Віцебскай вобласці ў дарожным руху не ўдзельнічала каля 12 тысяч аўтамабіляў. Заторы па-ранейшаму назіраліся ў Мінску і іншых гарадах, аднак адзначалася змяншэнне колькасці транспарту ў іх у параўнанні з папярэднімі днямі на ўзроўні 15 працэнтаў і больш. Паводле інфармацыі з месцаў, каля 20-30 працэнтаў работнікаў апаратаў кіравання арганізацый у гэты дзень не карысталіся асабістым аўтатранспартам. Напрыклад, па інфармацыі Мінгандлю, у «Белгандальпрагрэсе» больш за 350 чалавек, а ў «Белбыце» ўвогуле 90 працэнтаў работнікаў дабіраліся на працу ў грамадскім транспарце. Ужо па інфармацыі Мінтранса, у дзень правядзення акцыі адзначалася павелічэнне пасажырапатоку. Скажам, у гарадах Мінскай вобласці ў гадзіны «пік» дадаткова да дзейнага раскладу было выканана 368 рэйсаў.

Акрамя таго, па падліках канцэрна «Белнафтахім» падчас леташняга «Дня без аўтамабіля» знізіліся аб'ёмы спажывання аўтамабільнага паліва на АЗС і нафтабазах у параўнанні з папярэднім тыднем: бензіну — на 12,8 працэнта, дызельнага паліва — на 8 працэнтаў, звадкаванага газа — на 19,4 працэнта. Гэта дазволіла прадухіліць выкіды забруджвальных рэчываў у атмасферу краіны ў аб'ёме больш за 333 тоны. Такі вось «глыток» чыстага паветра.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Ігар БУЗОЎСКІ:

# «БРСМ сёння мае аўтарытэт не толькі ў моладзевым асяроддзі, але і ў грамадстве ў цэлым»

**25 верасня ў футбольным манежы сталіцы Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі правядзе моладзевы форум «ЗРАБІ СВОЙ ВЫБАР», прысвечаны 90-годдзю камсамола Беларусі і моладзевага руху краіны. Як адзначыў першы сакратар ЦК БРСМ Ігар БУЗОЎСКІ, у яго рамках у манежы адначасова будуць працаваць больш як 20 моладзевых пляцовак, якія будуць прэзентаваць самыя цікавыя праекты БРСМ і спецпраекты.**

— Дата правядзення мерапрыемства абраная невыпадкова, — гаворыць першы сакратар ЦК БРСМ. — Па-першае, 24 верасня камсамолу Беларусі спаўняецца 90 гадоў, а БРСМ, як яго пераемнік, захоўвае і ў сучасным фармаце развівае найлепшыя яго традыцыі, зарэкамендаваў сябе канкрэтнымі справамі, валодае аўтарытэтам не толькі ў моладзевым асяроддзі, але і ў грамадстве ў цэлым.

Па-другое, гэта выхадны дзень, субота, і ў маладых людзей будзе магчымасць наведаць усе пляцоўкі форуму. А працаваць форум будзе з 12 да 23 гадзін. У мерапрыемстве прымуць удзел каля 400 дэлегатаў — актывісты БРСМ, прадстаўнікі розных напрамкаў моладзевых субкультур, спартыўныя і творчыя калектывы з усіх куткоў краіны, ветэраны камсамольскага і моладзевага руху, прадстаўнікі моладзевых арганізацый краін блізкага і далёкага замежжа, з якімі актыўна супрацоўнічае БРСМ. Мы спадзяёмся, што пляцоўкі, якія будуць арганізаваныя падчас форуму, будуць яркімі і запамінальнымі.

У прыватнасці, увазе наведнікаў будуць прапанаваныя такія праекты, як Міжнародны міжінстытуцкі конкурс грацыі і артыстычнага майстэрства «Каралева Вясна», сямейны сельскагаспадарчы праект «Уладар сяла», «Міжнародная парусная рэгата», студатрадаўскі, валанцёрскі рух БРСМ «Добрае сэрца». Усе праекты, якія будуць прэзентаваныя на форуме 25 верасня, абавязкова будуць намі развівацца, бо яны атрымалі падтрымку моладзі. У бліжэйшы час мы будзем рабіць акцэнт на другаснай занятасці моладзі. Для нас гэта прыярытэтны кірунак.

Дарэчы, як чакаецца, група моладзі, пераапранутая ў касцюмы калгаснікаў, будатрадаўцаў, урачоў, даваенную і ваенную форму 40-х гадоў, а таксама «хуліганаў і стыляг праз перфоманс будзе аднаўляць элементы эпохі пачатку і сярэдзіны XX стагоддзя. Яркай падзеяй форуму стане аўтапрабег па галоўных праспектах беларускай сталіцы — Незалежнасці і Пераможцаў — і выстава вінтажных аўто і байкаў ля Футбольнага манежа.

Арганізатары абяцаюць здзівіць наведнікаў і бітвай лепшых брэйк-данс-каманд краіны. Пройдуць таксама паказальныя, трукавыя выступленні ролераў і велатрыялістаў. Адным з ноу-хау форуму стане турнір па збіранні пазлаў беларускай тэматыкі. А рэкардсмен кнігі рэкордаў Гінэса Кірыл Шымко абяцае паказаць усім не толькі валатаўскія забавы, але і прэзентаваць сваю школу здаровага ладу жыцця. А тры беларускія асілкі з тэатра сілавога экстрыму «Радзімічы» плануюць здзівіць удзельнікаў форуму шоу з элементамі жанглявання пудовай, двухпудовай гірамі і нават 40-кілаграмовай кегай. А Дэпартамент аховы МУС Беларусі плануе арганізаваць дэманстрацыю спецыяльных сродкаў узбраення і тэхнікі, а кожны ахвотны зможа паспрабаваць свае сілы ў зборцы і разборцы аўтамата Калашнікава.

Як заўважыў Ігар Бузоўскі, падчас форуму яго наведнікі змогуць прагаласаваць за ўпадабаную пляцоўку і самы цікавы праект. Для гэтага будзе стаяць спецыяльная урна са слоганам «Зрабі свой выбар!». Па выніках дня адабраная такім чынам лепшая пляцоўка будзе ўзнагароджана.

**Святлана СУХАРКО.**

# КШЫШТАФ ЗАНУСІ АДДАЕ БЕЛАРУСАМ ДАЎГІ

**Сусветна вядомы рэжысёр робіць гэта праз пастаноўку ў Нацыянальным тэатры імя Горкага**



Прэм'ера сумеснага беларуска-польскага праекта адбудзецца 21 верасня. Напярэдадні спадар Занусі патлумачыў журналістам, чаму абраў да пастаноўкі п'есу Арыэля Дорфмана «Дзева і Смерць», якая дагэтуль з поспехам прайшла ў сталіцах розных краін свету. Але польскі рэжысёр аказаўся першым, хто прывёз яе ў Беларусь. І для гэтага ў яго была асаблівая зацікаўленасць у сумеснай працы:

— Я думаю, шмат хто з палякаў, і я сярод іх, адчуваем нейкі доўг у адносінах да Беларусі. Таму што ў нас была сумесная складаная гісторыя. Мы адчуваем, што адцягнулі ў вас частку эліты — гэтыя людзі жывуць сёння ў Польшчы. Мы ў даўгу таму, што пакінулі вас з элітамі, якія былі не такімі багатымі, як маглі б. Зараз наш доўг — з вамі супрацоўнічаць і вас падтрымаць у развіцці, якое неабходнае. Мы аднойчы былі вельмі блізкія як дзве нацыі ў адной дзяржаве, потым разышліся. Але гістарычная памяць заўсёды жывая, і мы не забываемся, што тыя людзі, якіх мы называем палякамі, былі грамадзяне нашай агульнай дзяржавы, але яны паходзілі і з Беларусі, значыць, яны і вашы славутасці. І наш Міцкевіч, і наш Манюшка, і наш Дамейка, і Касцюшка — яны ўсе былі з Беларусі (як цяпер называецца гэтая краіна), значыць, яны былі беларусамі. З-за гэтай складанай гісторыі адносіны палякаў да беларусаў (мае, у прыватнасці) значна больш блізкія, чым да некаторых іншых нашых суседзяў, з якімі мы столькі сумеснага не маем.

Цяпер рэжысёр Занусі, дагэтуль вядомы нам толькі па кіно, мае ў Беларусі і сумесны тэатральны праект — з Нацыянальным драматычным акадэмічным тэатрам імя Горкага. Між іншым, у роднай Польшчы у тэатры ён не вельмі шмат працуе, затое ў іншых краінах паставіў каля 40 п'ес. Каб рэжысёру было прасцей паразумецца з беларускімі артыстамі, яны гасцявалі ў яго доме непадалёк ад Варшавы, на месцы даводзілася і рэпетаваць. Па прызнанні Таццяны Баўкалавай, гэта было даволі цяжка, бо ўся атмасфера — гасціннасць гаспадароў, прыгожы сад, сабакі, якіх так любіць сям'я Занусі, — вымагала разняволення. А п'еса насамрэч вельмі сур'ёзная.

— Хоць п'еса распавядае пра жыццё ў Чылі, наша задача — зрабіць яе зразумелай беларускаму гледачу. А Беларусь артысты прынеслі ў сабе, — гаворыць рэжысёр. — П'еса сучасная, вострая, яна поўная рэчаіснасці, і, спадзяюся, людзі гэта зразумеюць. Бо ў ёй ёсць універсальная думка, універсальнае пасланне, што ад віны немагчыма сысці — яна патрабуе пакарання. Гэта кожнае пакаленне павінна само сабе нагадваць, а таксама грамадству, бо без таго, каб справядліва асудзіць учынкі людзей, нельга ісці наперад. Мы ведаем, як пасля Другой сусветнай вайны было неабходна ачысціць памяць, каб асудзіць тых, хто паводзіў сябе неэтычна. Гэта ў п'есе паказана на ўніверсальным узроўні. Гэта тычыцца не столькі палітыкі, колькі этыкі.

У спектаклі ўдзельнічаюць артысты Таццяна Баўкалава, Аляксандр Ждановіч, Валерый Шушкевіч. З Таццянай рэжысёр Занусі аднойчы працаваў у адным журы на фестывалі. Ждановіча выпадкова бачыў у эпізодзе і пажадаў працаваць менавіта з гэтым артыстам. Шушкевіча абраў для супрацоўніцтва па фотакартцы. І не расчараваўся ні ў кім, а наадварот, калі выпадзе магчымасць, гатовы здымаць беларускіх артыстаў і ў кіно:

— Я заўсёды ўлюбляюся ў сваіх акцёраў, калі яны добрыя, то з іншымі не працую. Было б задавальненнем, калі б мы разам нешта зрабілі ў будучым. У Беларусі я патрапіў на акцёраў, якія мне прынеслі вялікую радасць.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# БУДЗЕМ ЖЫЦЬ, ЯК НАБЯЖЫЦЬ

Бяседныя песні

**Жыццё раздольнае. Увесь час яно разгортваецца разнастайна. Аднак паўсюль жыццёвыя працэсы трымаюцца адзінай асновы, як бы не змяняліся ўмовы. Гэта выразна пададзена ў песні «Будзем жыць, як набяжыць» Ізмаіла Капланава і Алеся Бадака: «трэба трымацца роднае маці, любай старонкі, вернае жонкі». Уся пачуццёвая гама грунтуецца на любові і расквечваецца ёю. Яна актывізуе духоўную дзейнасць асобы, а грамаду робіць маналітнай, стваральнай.**

Песня «Будзем жыць, як набяжыць» напісана пяць гадоў таму. Якаў Навуменка ўключыў яе ў свой рэпертуар — і яна хутка стала вядомай на ўсю краіну. Папулярнасці новаму вакальнаму твору спрыялі і мастацкая вобразнасць, блізкая да фальклорнай, і тэкст, у якім паэтычныя радкі нагадваюць крылатыя выразы, якія скіроўваюць на плённасць дзеяння.

**Будзем жыць, як набяжыць**

**Верш Алеся Бадака Музыка Ізмаіла Капланава**

Там за гарою
Зноў пір гарою.
А за пагоркам
Плачацца горка.
А ў нашай хаце —
Не разабрацца:
Тое і гэта*
З лета ў лета.

**Прыпеў:**
Будзем жыць, як набяжыць,
То смяяцца, то тужыць.
А над намі грымне гром —
Будзем жывы, не памром!
Ой ёй-ёй, будзе ўсяк,*
Або гэтак, або так!

Каб не прапасці,
Здолець напасці,
Трэба старацца
Разам трымацца.
Трэба трымацца
Роднае маці,
Любай старонкі,
Вернае жонкі.

**Прыпеў.**

Хто нам паможа,
Ведаюць Божа,
Маці ды жонка,
Чарыца звонка.
Вып'е на свята
Той, хто багаты.
Бедны і ў будзень,
Ой, не забудзе.

**Прыпеў.**

** Апошнія два радкі запеву і прыпеву паўтараюцца.*




**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**

**Абзац**

**Дваццаць сямейных пар Мінска праявяць свае лепшыя якасці ў барацьбе за званне «Суперсямейка», стаўшы ўдзельнікамі праекта «Сямейныя гонкі на лімузінах-2010». На працягу дня 5 шыкоўных лімузінаў будуць вазіць удзельнікаў у розныя куткі Мінска. Жонкі і мужы ў вясельных строях будуць з'яўляцца на вуліцах горада і выконваць самыя розныя заданні, якія патрабуюць кемлівасці і эрудыцыі.**

Два выпадкі самагубства зафіксаваныя ў адзін дзень у лячэбных установах Мінска. Органы пракуратуры праводзяць праверкі па фактах самагубства двух пацыентаў: у 9-й клінічнай бальніцы і РНПЦ псіхічнага здароўя ў Мінску. 16 верасня прыкладна ў 17.00 з балкона дзявятага паверха 9-й бальніцы выкінуўся 68-гадовы мужчына, які знаходзіўся на лячэнні. Пенсіянер памёр на месцы. Высветлілася, што за некаторы час да суіцыду мужчына знаходзіўся ў кепскім настроі, гаварыў, што яму надакучыла жыць і хварэць. У той жа дзень у Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры псіхічнага здароўя ў Навінках у прыбіральні была знойдзеная ў пятлі 44-гадовая пацыентка.

**Электрычкі ў Расіі будуць здаваць у арэнду для паездак на прыроду. Такі новы від паслуг прапанавалі расійскія чыгуначнікі. Пакарыстацца паслугай можна пакуль толькі на дзвюх лініях. Карпаратыўныя кліенты могуць замовіць электрычкі для паездак на пікнік, паляванне ці рыбалку. Каб скарыстацца электрычкай па выкліку, трэба падаць заяўку за 16 дзён да запланаванай паездкі і ўнесці аплату за паслугу. Кошт замовы вызначаецца проста: у кожным электрацягніку 12 вагонаў, у кожным вагоне 120 месцаў. Гэтыя дзве лічбы перамнажаюцца, а затым атрыманы лік трэба памножыць на кошт аднаго білета па тарыфе.**

Аўтаканцэрн Fiat падзяліўся на 2 кампаніі. Акцыянеры італьянскага машынабудаўнічага канцэрна зацвердзілі карпаратыўны план па раздзяленні бізнэсу. Створаны дзве незалежныя кампаніі Fiat и Fiat Industrial. Першая зоймецца вытворчасцю легкавых аўтамабіляў, уключаючы мадэлі: Fiat, Alfa Romeo, Lancia, Ferrari і Maserati, а таксама мадэльны рад свайго амерыканскага партнёра — кампаніі Chrysler. Fiat Industrial зоймецца вытворчасцю спецтэхнікі. Яна будзе выпускаць грузавікі Iveco, сельскагаспадарчую і будаўнічую тэхніку, рухавікі і камплектуючыя для аўтамабіляў і марскіх суднаў.

**Поўны абзац**



**Сабака з языком у 12 см трапіў у кнігу Гінэса. 10-гадовы пекінэс Пагі, якога пакінулі ў гадавальніку на ўсыпленне яго першыя гаспадары з-за яго неардынарнай знешнасці, стаў сапраўднай зоркай. Рэч у тым, што даўжыня яго языка стала падставай для запісу ў кнізе рэкордаў Гінэса. 11 сантыметраў і 43 міліметры — такая афіцыйна зафіксаваная даўжыня языка Пагі. «Сумна, калі сабаку пакідаюць паміраць толькі з-за таго, што ў яго не зусім звыклы знешні выгляд, — кажа новы гаспадар Пагі з Тэхаса. — Я адразу вырашыў забраць яго: усе мінакі заўсёды абарочваюцца, калі бачаць яго. А сам сабака — вельмі шчаслівы».**

У Новай Зеландыі пачалі гандляваць падробленай мачой. Сінтэтычная мача прызначаная для фальсіфікацыі аналізаў на ўжыванне наркотыкаў, якія праводзяць многія працадаўцы. Вадкасць, якая прадаецца, па хімічным складзе практычна не адрозніваецца ад звычайнай мачы здаровага чалавека. Многія фірмы гарантуюць 100-працэнтнае праходжанне аналізаў і абяцаюць вярнуць грошы, калі гэта будзе не так. Сінтэтычная мача прадаецца ў камплекце з награвальнікам, які ў патрэбны момант надае ёй тэмпературу цела, і са спецыяльнай трубкай, якая дазваляе імітаваць мочаспусканне, калі за здачай аналізу нехта назірае. Кошт такога набору складае ад 75 да 100 новазеландскіх долараў (прыкладна ад 54 да 73 дол. ЗША). Спецыялісты адзначаюць, што адрозніць сінтэтычную мачу ад сапраўднай практычна немагчыма, адзінае адрозненне ў тым, што яна не мае паху.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# ДАПАМАГЧЫ ПТУШКАМ

## Маркетолагі пасябравалі з сокаламі



**Сёння ў прыгарадзе Мінска — Мачулішчах, на тэрыторыі будучага біялагічнага заказніка «Сакаліны» адбудзецца дабрачынны валанцёрскі рэйд маркетолагаў Беларусі.**

Як паведаміў рэдакцыі **кіраўнік грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Віктар ПІНЧУК**, удзельнікі акцыі будуць займацца ўборкай тэрыторыі будучага заказніка, збіраць смецце на лясных палянах, добраўпарадкоўваць экалагічную сцежку, а таксама пад кіраўніцтвам спецыялістаў АПБ майстраваць і развешваць штучныя гняздоўі пустальгі.

Віктар Пінчук адзначыў, што заказнік «Сакаліны» ствараецца для захавання і вывучэння ўнікальнага прыроднага комплексу, на тэрыторыі якога жывуць рэдкія птушкі, занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі. Нагадаю, што 2010 год у Беларусі аб'яўлены Годам пустальгі, прыгожай драпежнай птушкі сямейства сакаліных. Менавіта гэтая рэдкая птушка ўяўляе найбольшую прыродаахоўную каштоўнасць будучага заказніка «Сакаліны».

Валанцёрскі рэйд арганізаваны штабам прафесійнага конкурсу «Брэнд года» сумесна з ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Гэта першы сумесны сацыяльны праект прафесійнага згуртавання маркетолагаў, які атрымаў назву «Узляці высока». Нам вельмі прыемна, што сур'ёзныя кабінетныя работнікі пачалі больш актыўна цікавіцца праблемамі экалогіі і біялагічнай разнастайнасці нашай краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Акцыя ДАІ**

## АЛКАГОЛЬ І АЎТАМАБІЛЬ — НЕСУМЯШЧАЛЬНЫЯ!

**Увесь бліжэйшы тыдзень, аж да наступнай нядзелі, Дзяржаўтаінспекцыя краіны праводзіць прафілактычную акцыю «П'янаму не месца за рулём!».**

Супрацоўнікі ДАІ ўзмоцняць нясенне службы на многіх трасах (не толькі ажыўленых), у тым ліку і ноччу. ДАІ таксама звяртаецца да ўсіх неабыякавых: калі вы ўбачылі, што нецвярозы чалавек садзіцца за руль аўтамабіля, патэлефануйце ў міліцыю, паведаміце нумар і марку яго машыны. Гэта дапаможа папярэдзіць бяду на дарозе.

**Марыя ДЗЬЯКАВА,**
**старшы інспектар АДАІ Савецкага раёна г. Мінска.**

## АНАЛІТЫКУ НЕ ПАШЧАСЦІЛА

**Позна ўвечары жыхар г. Пружаны пасварыўся на беразе вадасховішча «Сялец» (Бярозаўскі раён) з жыхаром Масквы — аналітыкам цэнтра расследавання бюджэтных адносінаў.**

Расіянін атрымаў цялесныя пашкоджанні, а з яго крыўдзіцеля ўзялі падпіску аб нявыездзе.

## П'ЯНЫ ЗАБІЎ 3-ГАДОВАЕ ДЗІЦЯ

**У доме 24-гадовай жыхаркі в. Мохра (Іванаўскі раён) знойдзена мёртвай 3-гадовая дзяўчынка — яе дачка.**

Малая мела парок сэрца і была інвалідам 2-й групы. На першы погляд прыкмет гвалтоўнай смерці на трупе не было, але калі абследаванне зрабіла судова-медыцынская экспертыза, то было ўстаноўлена, што ў дзіцяці паламаныя рэбры, разарваныя ныркі і печань. А забіў дзяўчынку мясцовы жыхар, рабочы ААТ «Баравіца», які быў п'яны.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# КІЕЎСКАЕ «ДЫНАМА» ПРАСІЛА ПАЧАКАЦЬ

## БАТЭ стартавала з нічыёй у Лізе Еўропы



**Здавалася б, БАТЭ, прайшоўшы пазалетась Лігу чэмпіёнаў з «Рэалам» і «Ювентусам», атрымаўшы першыя перамогі ў леташняй Лізе Еўропы, у тым ліку над англійскім «Эвертанам», нічым нас здзівіць не можа. Тым больш што група сёлета спецыфічная: два з трох супернікаў — з прастораў былога СССР. Каманды, з якімі нашы футбольныя спецыялісты сустракацца не любяць, якія, здаецца, не надта цікавыя нашаму балельшчыку.**

Але БАТЭ зняважыла фаварыта групы, слаўнае кіеўскае «Дынама», забіўшы на яго полі два мячы ў адказ на столькі ж. Дарэчы, пры адпаведнай падтрымцы — беларускіх балельшчыкаў на матчы была рэкордная колькасць. У Кіеў быў арганізаваны адзін з самых масавых выездаў (акрамя ўласных аўтамабіляў і цягнікоў заўзятараў прывезла 13 аўтобусаў), беларускаму боку было прададзена крыху больш за тысячу білетаў (яны каштавалі 11 еўра). Перад матчам не толькі гульцы кіеўскай каманды, але і ўсе, акрамя адданых балельшчыкаў нашага чэмпіёна, меркавалі: і сапраўды, ну што такое БАТЭ супраць самога кіеўскага «Дынама», за якім не толькі імя, слава, але і грошы?! Магчыма, гэтак жа думалі ў свой час гульцы і «Рэала», і «Ювентуса», толькі еўрапейцам характэрная большая дыпламатыя і стрыманасць: «БАТЭ маладая каманда, якая можа прычыніць непрыемнасці любому суперніку» — прыкладна так выказваліся нашы апаненты. У інтэрв'ю гульцоў украінскай каманды ўсё было больш прама і з пагардай. Ігар Шытаў вырашыў ім адказаць і расказаў журналістам, што ад былой славы кіеўскага «Дынама» засталася толькі шыльда. Украінцы і ўсе, хто не любіць БАТЭ, потым радаваліся, калі з-пад носу і пры поўным патуранні гэтага абаронцы былі забітыя два мячы, і калі Шытаў убачыў жоўтую картку. Але гучную аплявуху атрымала ўсё ж кіеўскае «Дынама». 2:2 са слабай па іх уласных прызнаннях камандай — гэта ні ў якія вароты.

Матч быў супрацьстаяннем характараў, і наша каманда яшчэ раз пацвердзіла, што з гэтым у яе праблем няма. Хуткі гол Віталя Радзівонава зусім не збянтэжыў суперніка. Гэтак жа не павялі вокам дынамаўцы і пасля не рэалізаванага сваім капітанам Мілеўскім пенальці. Першы тайм застаўся за ўкраінцамі, якія паступова расхіствалі барысаўскую абарону і свайго дасягнулі — на перапынак каманды адпраўляліся з лікам 2:1. Праўда, такой перавагі ў другім тайме ў гаспадароў не было, а беларусы, дзякуючы Паўлу Няхайчыку, лік зраўнялі.

Асобным фактарам у супрацьстаянні быў ураджэнец Мінска Арцём Мілеўскі. Шмат гадоў таму адмовай выступаць за нашу зборную і выбарам на карысць украінскай ён знайшоў такую славу і ўвагу ў балельшчыцкім асяроддзі, якой, напэўна, і сам не рады. Але футбаліст пры любым зручным выпадку — ці то ў зборнай, ці тое ў клубе — з імкненнем, вартым лепшага прымянення, стараецца адказваць на заўзятарскую нелюбоў. Красамоўныя жэсты ў бок фанацкіх сектараў БАТЭ сведчылі, што футбалісту неабыякавая іх ўвага, у перапынку паміж таймамі ён ледзь не пабіўся з запасным варатаром БАТЭ Гутарам (у беларускай тэлетрансляцыі гэты эпізод быў пракаментаваны: «На каго там гаўкае Мілеўскі?»). А напрыканцы ў тэлеінтэрв'ю гулец заявіў: «Пачакайце, мы яшчэ ў Мінск прыедзем» . Так што, можна не сумнявацца, што ў Мінску нас чакае цікавы матч у адказ.

Валерый Газаеў, які ў свой час з маскоўскім ЦСКА выйграваў Кубак УЕФА, пасля матчу з барысаўскім клубам збіраўся падаць ў адстаўку. «Я затрымаўся ў раздзявальні, таму што была размова з гульцамі. Усё вельмі дрэнна. А калі так, то вінаваты адзін чалавек — галоўны трэнер. Звяжуся з прэзідэнтам клуба, каб ён прыняў рашэнне». Праўда, як вядома Ігар Суркіс Газаеву давярае. «Дынама» летась не здолела выйграць унутраны чэмпіянат, сёлета пакуль таксама адстае ад «Шахцёра», і галоўнае — упершыню за чатыры гады праляцела міма Лігі чэмпіёнаў.

Віктар Ганчарэнка пасля матчу прызнаўся, што ў перапынку пасля першага тайма, калі БАТЭ забіла хуткі гол і прапусціла два, размаўляў з гульцамі на «павышаных танах». Але нічыя, паводле яго слоў, — заканамерны вынік матчу, і ён удзячны сваёй камандзе. «У «Дынама» была адчувальная перавага ў першым тайме, але пасля перапынку мы выходзілі з надзеяй адыграцца. Гэта адбылося, але мы ўсё роўна не закрываліся, у абароне не сядзелі, хоць можна было паспрабаваць адысці ўсёй камандай назад і адстойваць нічыю. Мы імкнуліся наперад, песцілі надзею, што ўдасца выйграць. Хто быў лепшым гульцом? Як заўсёды, лепшай была каманда».

**А вось як каментуюць матч украінскія заўзятары на сайтах у інтэрнэце:**

«Брава, Ганчарэнка! Вельмі спадабаўся БАТЭ, вельмі! Розніца з украінскімі серадняччкамі, якія «абдзелываюцца» яшчэ да пачатку матчу, відавочная. А тут прыехалі мужыкі, апусцілі дынамаўцаў у перадматчавых каментах, аніякага страху перад быццам бы вялікім клубам не выказалі і слаўна паганялі гэты самы клуб па полі. Скажыце дзякуй, што судзейка яшчэ пеналь картапляным не даў, калі Маргао збіў Скавыша ў штрафной. А Ганчарэнка яўна заслугоўвае асобнай заметкі. З цікавасцю назіраю за працай гэтага юнага спецыяліста. Яны яшчэ ў 2008-м гулялі з Юве і «Зенітам» у ЛЧ і не былі мяшкамі для біцця».

**Ks0i.**

«Прыемна глядзець на беларусаў. Заўсёды падабаецца назіраць станаўленне характару ў каманды. Нагадалі «Дынама» у ЛЧ 97-га».

**Letel_i_tayal.**

«БАТЭ малайцы. Факт. Чымсьці нагадалі «Дынама»-Кіеў 97/98 98/99. Тая ж каманда аднадумцаў, землякоў (бразілец іх таксама амаль беларус). Без страху, без дрыжыкаў у каленках (толькі ў першыя хвілін 5-7, калі Гусеў павінен быў 2 класці). «Дынама»... Хіба маты, ці прамаўчаць трэба».

**Akg0209.**

«Толькі са стадыёна ў Кіеве, нармальная падтрымка была ў Барысава, мясцовыя ў шоку».

**Хахол, Кыів.**

«Годна барысяты выглядалі»...

**Badger.**

У другім паядынку групы Е, дзе выступаюць барысаўчане, галандскі клуб АЗ не без цяжкасці адолеў малдаўскі «Шэрыф» з Ціраспаля — 2:1. Наступныя паядынкі групы Е пройдуць 30 верасня. БАТЭ на мінскім стадыёне «Дынама» прыме галандскі АЗ, а «Шэрыф» у Ціраспалі згуляе з кіеўскім «Дынама».

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## «БЕЛА-БЛАКІТНЫЯ» СТАЛІ ЛІДАРАМ КХЛ

### Сталічны клуб набраў больш за ўсіх ачкоў

Пераадолеўшы тысячы кіламетраў і змяніўшы два часавыя паясы, сталічнае «Дынама» ўчора зноў атрымала перамогу. У гасцях у хабараўскага «Амура» мінчане выйгралі 4:2 — гэта трэцяя выязная і чацвёртая запар перамога клуба. Увогуле ж сёлетні старт стаў самай доўгай пераможнай серыяй беларусаў у КХЛ.

У цяперашнім далёкім падарожжы па Сібіры, якое скончылася на мяжы з Кітаем, гледзячы па ўсім, ніхто, у тым ліку і галоўны трэнер нашай дружыны Марэк Сікора, на перамогу не разлічваў. «Шчыра кажучы, не чакаў, што ў такой цяжкай паездцы здолеем узяць максімум ачкоў. Сёння ўвогуле не ведаў, што чакаць: доўгія пералёты, змена часавых паясоў — гэта няпроста. Але сыгралі вельмі разумна», — прыводзіць словы трэнера «Прессбол».

Цяпер сталічная каманда ўзначальвае як заходнюю канферэнцыю, так і зводную табліцу ўсёй лігі, маючы на сваім рахунку 12 ачкоў пасля 5 матчаў. Нагадаем, што наш клуб дома абыграў яраслаўскі «Лакаматыў» (3:0), а на выездзе — новакузнецкі «Металург» (5:2), новасібірскую «Сібір» (4:2) і хабараўскі «Амур» (4:2). Марэк Сікора пракаментаваў такі поспех наступным чынам:

— Я прыводзіў раней прыклад з дрэвам, на якое не трэба спяшацца ўзбірацца. Камандзе трэба даць спакойна папрацаваць. Тады і пра большае можна падумаць, чым пападанне ў плэй-оф.

Цяпер «Дынама» правядзе трохматчавую хатнюю серыю, дзе 21 верасня згуляе з казанскім «Ак Барсам», 23 верасня — з ніжнякамскім «Нафтахімікам» і 25 верасня — з екацярынбургскім «Аўтамабілістам».

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

**Кубак Дэвіса**

## БЕЛАРУСЬ — СЛАВАКІЯ: ПАКУЛЬ НІЧЫЯ



Фота БЕЛТА.

Уладзімір ІГНАЦІК.

**Учора ў Мінску прайшлі першыя сустрэчы матчу Беларусь — Славакія ў першай групе Еўра-Афрыканскай зоны. Нагадаем, што няўдачнік гэтага супрацьстаяння адправіцца ў групу рангам ніжэй. Пасля першага дня лік быў нічыйным — 1:1.**

У стартавай сустрэчы лідар нашай каманды Уладзімір Ігнацік (160-ты рэйтынг) выйграў у другой ракеткі каманды гасцей Марціна Кліжана (255) — 7:6, 6:2, 6:2. У другім паядынку наша другая ракетка Сяргей Бетаў (426) саступіў першаму нумару гасцей Лукашу Лацко (76) — 0:6, 4:6, 4:6. Сёння адбудзецца парная сустрэча, дзе згуляюць Максім Мірны і Уладзімір Ігнацік супраць Міхала Мерцінака і Філіпа Палашака. У нядзелю пройдуць дзве адзіночныя гульні.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

ККУП «Витебский областной центр маркетинга» сообщает, что в информационном сообщении о проведении аукциона по продаже лота № 1 права заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 221288109601000369 площадью 0,1588 га, расположенного по адресу: Витебская обл., Витебский район, Октябрьский с/с, д. Сокольники, У-91, опубликованном в газете «Звязда» № 160 от 18.08.2010 г. функциональное назначение земельного участка, срок аренды, дополнить текстом следующего содержания: «Срок аренды 25 лет».
Приносим свои извинения.
Контактный тел. (0212) 47 97 35, e-mail: vcm74@mail.ru, vitinvest.biz

Генеральны дырэктар РУП «Магілёўаўтадар» Анатоль ЛАПАЦІН:

# «НАШАМУ КАЛЕКТЫВУ НЕ СОРАМНА ЗА ДАРОГІ, ЯКІЯ БУДУЕМ І РАМАНТУЕМ»





## ЗНАЁМІМ З СУРАЗМОЎЦАМ

**Ураджэнец Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці. Пасля заканчэння сярэдняй школы вучыўся ў Магілёўскім хіміка-тэхналагічным тэхнікуме, а пасля яго, працуючы ўжо ў сферы вытворчасці, закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут.**

**Працоўная біяграфія маладога спецыяліста пачалася з пасады тэхніка дырэкцыі па будаўніцтве дарог Магілёўскай вобласці і працягвалася там некалькі гадоў: інжынер, старшы інжынер, намеснік начальніка, а потым і начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела, намеснік начальніка дырэкцыі. Калі ў рэспубліцы стварылася сістэма «Аўтадара», Анатоль Іванавіч быў прызначаны намеснікам генеральнага дырэктара РУП «Магілёўаўтадар». Высокі прафесіяналізм, патрабавальнасць да сябе і падначаленых па службе, уменне ладзіць з людзьмі дазволілі яму ў 2003 годзе ўзначаліць калектыў.**

**У дарожнай галіне А. Лапацін працуе больш за 30 гадоў. З'яўляецца ганаровым дарожнікам рэспублікі, удастоены падзякі кіраўніка дзяржавы.**

**— Анатоль Іванавіч, не шкадуеце, што калісьці прыйшлі працаваць у гэту нялёгкую галіну гаспадарання?**

— Не шкадую. Дарогі для мяне — мой выбар, мой лёс, маё жыццё. Калі ж гаварыць у больш шырокім плане, то ўсім вядомая іх роля. Дарогі — гэта артэрыі эканомікі. Яны паскараюць развіццё цывілізацыі, звязваюць паміж сабой гарады, вёскі, людскія лёсы.

**— Наш звяздоўскі «дэсант» ужо не першы раз наведвае вашу арганізацыю, і мы ведаем, што калектыў «Магілёўаўтадара» заўсёды стараўся выконваць даведзеныя заданні, працаваць стабільна, якасна. Што можна сказаць пра вынікі работы за мінулы год?**

— Што ўсё ў парадку. 2009 год быў насычаны ўводам у эксплуатацыю значнай колькасці аб'ектаў, два з якіх мы лічым вельмі важнымі. Гэта мост цераз Сож у раёне Крычава даўжынёй амаль 296 метраў з падходамі да яго ў 4,7 кіламетра і ўчастак хуткаснай чатырохпалоснай дарогі М-4 (Мінск—Магілёў) на адзнацы 176—182 кіламетры.

**— Калі можна, больш падрабязна пра гэта...**

— Мост быў пабудаваны пасля вайны ў 1956 годзе і быў ужо ў пагражальным становішчы, бо адбылося адхіленне адной апоры. Таму было вырашана зрабіць яго дэмантаж. Работы выконваліся Віцебскім мостаатрадам № 425. Ім жа сумесна з інстытутам «Белгіпрадар» была распрацавана тэхналогія разборкі моста з тым, каб канструкцыі старога захаваць (не ператвараючы ў металалом), што дазволіла зберагчы значныя фінансавыя сродкі. Тым больш, што мы атрымалі тэхнічнае заключэнне Беларускага дарожнага навукова-даследчага інстытута пра тое, што металічныя фермы могуць праслужыць не адзін дзясятак гадоў пры будаўніцтве іншага моста на так званай другараднай дарозе, бо па габарытах яны тут не падыходзілі. Унікальнасць тэхнічнага рашэння заключалася яшчэ і ў тым, што дэмантаж рабіўся з прымяненнем магутных баржаў (бо адна ферма важыць 270 тон). Не буду прыводзіць усе падрабязнасці справы. Толькі адзначу, што была зроблена надбудова (мост вельмі высокі), прытоплены баржы, прыменены вядомы метад Архімеда і г.д. Фермы вывезлі ў затон, дзе яны знаходзяцца на кансервацыі і будуць выкарыстаны на будаўніцтве моста ў раёне Слаўгарада (пачатак работ запланаваны ў наступным годзе).

**— А другі аб'ект?**

— Мы ўключыліся ў эфектыўную работу па развіцці сеткі дарог першай тэхнічнай катэгорыі М-4 (Мінск—Магілёў) і М-5/Е271 (Мінск—Гомель). Летась пачалі эксплуатавацца ўчастак аўтадарогі М-4 працягласцю 6,1 км і транспартная развязка ў раёне горада Асіповічы (5,8 км). Агульная ж працягласць уведзеных у строй у 2009 годзе аўтадарог склала 18,7 кіламетра пры зацверджаным плане 13,9 кіламетра. А ў цэлым мы абслугоўваем 2485 кіламетраў дарог.



Намеснік генеральнага дырэктара па вытворчасці ТЫЛЕЦ Сяргей Аркадзьевіч.

**— Якая ў вас была летась сітуацыя з рамонтам аўтадарог?**

— Пры капітальным рамонце сіламі падрадных арганізацый асвоена 14,5 мільярда рублёў, уведзена 14,1 кіламетра дарог і 46,5 метра мастоў. Хачу адзначыць, што, нягледзячы на рэзкае скарачэнне праграмы работ (да папярэдняга года яна склала на 35 % менш), вялікая ўвага надавалася рамонту магістральных трас. Капітальны рамонт быў зроблены на двух участках дарогі М-5 працягласцю 4,8 і трох участках дарогі М-8 (Віцебск—Гомель—мяжа з Украінай) працягласцю 6,4 кіламетра. Пры бягучым рамонце асвоена 19,5 мільярда рублёў і ўведзена 180,8 кіламетра аўтадарог і 320 метраў мастоў. За ўвесь жа год сіламі ўсіх нашых дзевяці ДЭУ выкананы аб'ём работ на 48,6 мільярда рублёў. Гэта 29,8 % ад агульнага выканання на дарогах, якія абслугоўваем.

**— А як з іншымі паказчыкамі?**

— Пра стабільнасць нашай работы сведчыць і наступнае. Пры даведзеным заданні энергазберажэння ў 11 % выкананне склала 11,1 %. Узровень платных паслуг таксама перавышаны на 2,8 % да плана.

**— Ці не здаецца вам, што і сёлета задачы перад работнікамі прадпрыемства не менш напружаныя?**

— Што значыць — здаецца? Яно так і ёсць на самай справе. Сёння рэканструюецца 9 кіламетраў дарогі М-4 на ўчастку абходу каля вёскі Вішава і 10 км у абход горада Бялынічы. Пачынаем таксама будаўніцтва двух участкаў дарог у раёне вёсак Свяцілавічы і Вялікая Машчаніца. У распрацаванай праграме ёсць і будаўніцтва пуцепровода праз чыгунку, і рэканструкцыя моста цераз Дняпро ў раёне Шклова. І гэта далёка не ўсё. Клопатаў хапае.

**— Вядома, што будаўніцтва такіх хуткасных дарог, як М-4 і М-5 — справа вельмі дарагая, патрэбны сапраўды вялікія фінансавыя сродкі. Ці заўсёды яны ёсць?**

— Грошы выдзяляюцца з бюджэту. Але па даручэнні Савета Міністраў прапрацоўваецца пытанне і з замежнымі інвестарамі, і з банкамі. Сёлета дадаткова выдзяляецца крэдыт ААБ «Беларусбанк» (25 мільярдаў рублёў) на будаўніцтва дарогі М-4 Мінск—Магілёў.

## РУП «Магілёўаўтадар» — гэта:

- Уладальнік аўтамабільных дарог на тэрыторыі вобласці.
- Заказчык па будаўніцтве, рамонце і ўтрыманні рэспубліканскіх дарог.
- Тэхнічны нагляд за вытворчасцю работ на аўтамабільных дарогах.
- Бягучы рамонт і ўтрыманне аўтадарог сіламі падведамных ДЭУ.
- Вытворчасць бітумных эмульсій.
- Выпуск арганамінеральных сумесяў складзіруемых гідрафобных халоднага прыгатавання.
- Разметка аўтамабільных дарог.

У наступныя два гады будзе выдзелена яшчэ 300 млрд рублёў на заканчэнне будаўніцтва. Фінансаванне рэканструкцыі дарогі М-5/Е271 Мінск—Гомель на ўчастку ад Пухавіч да Бабруйска ажыццяўляе Сусветны банк рэканструкцыі і развіцця. А гэта — 150 мільёнаў долараў.

Дэпартамент «Белаўтадар» прапрацоўвае пытанне і аб прыцягненні іншых інвестараў з кітайскімі і французскімі крэдытамі на будаўніцтва хуткаснай дарогі першай катэгорыі М-5/Е271. Праўда, канчатковага рашэння пакуль няма, але пошук інвестараў ідзе актыўна. На бліжэйшыя два гады пастаўлена задача закончыць будаўніцтва дарогі М-4 Мінск—Магілёў.

**— Ці можаце, Анатоль Іванавіч, сказаць, што вашаму калектыву не сорамна за дарогі, якія будуеце і падвяргаеце рэканструкцыі?**

— Магу. Мы распрацавалі палітыку ў галіне якасці, экалогіі і аховы працы, узялі на сябе адказнасць за арганізацыю і кіраванне працай, звязанай з функцыяніраваннем і аналізам выніковасці сістэмы менеджменту, якая адпавядае патрабаванням Міжнародных стандартаў СТБ ІСО 9001 і 14001, СТБ 18001 і пастаянным паляпшэннем яе і ўсёй нашай дзейнасці, чаму садзейнічаюць многія фактары.

**— Напрыклад?**

— Летась мы за свае грошы пабудавалі ў Бабруйску завод па выпуску бітумных эмульсій, а сёлета наладзілі вытворчасць іх, што адразу адбілася на эфектыўнасці нашай работы. Справа ў наступным. Раней эмульсію мы куплялі для правядзення бягучага рамонту аўтадарог і іх утрымання ў прадпрыемстваў іншых абласцей. Гэта было нязручна, а часам нават нервозна, бо не заўсёды мы маглі бітумную эмульсію атрымаць (пастаўшчык у першую чаргу забяспечвае ёю свае прадпрыемствы).

**— Якія перавагі дае прымяненне бітумнай эмульсіі?**

— Няхай пра гэта раскажа мой намеснік па вытворчасці Сяргей Аркадзьевіч Тылец.

— Курс на прымяненне ў самым шырокім спектры тэхналогій, звязаных з выкарыстаннем бітумных эмульсій, мы ўзялі з часу стварэння РУП «Магілёўаўтадар». Сёлета перайшлі цалкам на паверхневую апрацоўку дарог з яе прымяненнем. Дзякуючы гэтаму дасягаецца зніжэнне сабекошту работ, скарачаюцца энергазатраты, павялічваецца прадукцыйнасць працы, паляпшаецца якасць з адначасовым павелічэннем тэрміну рамонтнага перыяду ў параўнанні з «гарачымі» тэхналогіямі.

**— А што ўяўляе сабой бітумная эмульсія?**

У размову ўступае намеснік начальніка ДЭУ-72 Валерый Фёдаравіч Калеснікаў:

— Гэта 65—70 % бітуму і 30—35 % вады, эмульгатара і кіслаты. Калі вада выпараецца, адбываецца стабілізацыя матэрыялу: ён змацоўваецца з палатном дарогі, на што патрабуецца пэўны час.

**— Але бягучыя рамонты вядуцца ў час руху транспарту. Ці не бывае так, што кіроўцы перашкаджаюць вам?**

— На жаль, бывае, нягледзячы на тое, што на гэтыя работы ўказваюць адпаведныя дарожныя знакі. Асобныя кіроўцы не захоўваюць хуткасны рэжым, заязджаюць на рамонтныя палосы, наладжваюць на іх абгоны і г.д. Нярэдка гэта і велікагрузны транспарт.

Карацей кажучы, ніякіх праблем з бітумнай эмульсіяй мы сёлета не адчуваем, правяраем якасць яе і ў акрэдытаванай лабараторыі ў Магілёве, і непасрэдна на заводзе ў Бабруйску.

**— Магчыма, ужо знайшліся і пакупнікі на яе?**

— Сёлета мы вырабілі 2,5 тысячы тон эмульсіі і забяспечылі ёй усе свае ДЭУ. Частку прадалі дзвюм іншым арганізацыям і ў перспектыве аб'ём продажу думаем павялічыць. Цяпер у наяўнасці пяць ёмкасцяў для бітумных эмульсій на 25 тон кожная, да іх у наступным годзе прыбавіцца столькі ж. Зыходную сыравіну (бітум) мы завозім з Наваполацка спецыяльным грузавіком, і адзін рэйс абыходзіцца нам у 2,5 мільёна рублёў. Таму намечана бітум прывозіць па чыгунцы ў цыстэрнах, што будзе танней. Далей пойдзе працэс ператварэння бітуму ў эмульсію з выкарыстаннем палімераў.

**— Якія ўдасканаленыя тэхналогіі вы яшчэ прымяняеце?**

Сяргей Тылец: Мы таксама асвоілі выпуск арганамінеральнай сумесі халоднага складавання. Яна добра зарэкамендавала сябе і па павышэнні прадукцыйнасці працы, і па эканоміі рэсурсаў і часу, таму на сёння з'яўляецца лепшай тэхналогіяй, якая прымяняецца для ямачнага рамонту. Яна запатрабавана і ў іншых арганізацыях рэспублікі. З гэтай нагоды мы мадэрнізуем лінію па вытворчасці і расфасоўцы сумесі ў мяшкі, што дазволіць павялічыць выпуск яе і продаж.

**— Анатоль Іванавіч, сёлета ў Беларусі стаяла афрыканская спякота. Вельмі цяжка даводзілася і дарожнікам. Які рэжым работы быў у вашага калектыву?**

— З-за спякоты пачыналі працаваць а палове шостай гадзіны раніцы. Перапынак — з 12 да 15 ці 16, а потым зноў работа да 20 гадзін. Дарэчы, і тэхніка іншым разам не вытрымлівала, патрабаваўся больш часты, чым звычайна, рамонт яе.

Магу сказаць, што ў нас, у адрозненне ад іншых калектываў, ненармаваны графік работ, асабліва ў зімні перыяд. Работы па ліквідацыі слізкасці вядуцца з моманту яе з'яўлення да поўнага ўхілення. Праца вельмі высокаінтэнсіўная. Цяпер, напрыклад, на аднаго дарожнага рабочага прыпадае 20 кіламетраў дарог. І я вельмі ўдзячны нашаму стабільнаму калектыву за ініцыятыву, стараннне і цярпенне.

**— Напэўна, не абышлося і без таго, што ў такіх складаных умовах з'явілася калейнасць на дарогах...**

— Не буду ўтойваць: ёсць і аварыйныя ўчасткі. Але я ў цэлым задаволены, што ў гэтай сітуацыі дарогі захаваліся, хаця чакаў горшага. Прычыны тут у тым, што і служба пры дэпартаменце «Белаўтадар» адсочвае перамяшчэнне грузаў, не дапускаючы перавышэння іх вагі. У кожным ДЭУ дзейнічаюць пасты ў такія гарачыя летнія перыяды, правяраецца дакументацыя на нагрузку восяў аўтамабіляў. У гэтых адносінах мы плённа супрацоўнічаем з ДАІ. Падобнага няма ва Украіне і Расіі, і там калейнасць на дарогах шматразова павялічылася.

**— Якія праблемы, Анатоль Іванавіч, хвалююць ваш калектыў?**

— Скажу так: нам не сорамна за нашы дарогі. Аднак што атрымліваецца? Вядома, будаўніцтва новых аўтатрас — справа добрая і патрэбная. Але мы ўпускаем тую дарожную сетку, якая ўжо створана. Бо выдзяляецца намнога менш фінансаў на бягучы і капітальны рамонты і ўтрыманне дарог, чым было раней. А патрабаванні да гэтых пытанняў пастаянна растуць. Напрыклад, тых грошай хапае толькі на капрамонт 15—20 кіламетраў у год. А колькі іх, тых кіламетраў! Таму пытанне фінансавання стаіць вельмі востра.

Далей. Я на нарадах у аблвыканкаме ўказваў, што ў мясцовай вертыкалі (у раёнах) не ўсе разумеюць праблему навядзення парадку на дарогах.

**— Што вы маеце на ўвазе?**

— Ды тое, што чысціню на іх патрабуюць толькі ад нас. А няўжо гэта не справа міліцыі, ДАІ? Бо што іншае, як не парушэнне парадку ці псаванне маёмасці патрэбна разглядаць выпадкі, калі дачнікі псуюць адхоны, вымаючы з іх пясок ці гліну для сваіх гаспадарчых мэтаў? А колькі смецця выкідваецца на дарогу ў час руху транспарту? Кожны дзень прыбіраем яго. А вандалізм на дарогах! Гады чатыры таму мы пабудавалі на іх аўтапавільёны з прафільнага металу. Прыгажосць, ды і толькі. І што ж? Іх поўнасцю ўжо «распранулі». І мы вымушаны былі вярнуцца да старога — рабіць іх з жалезабетону. А гэта — учарашні дзень. Нярэдкія выпадкі крадзяжоў прыгожых металічных столікаў і лавак з прыдарожных пляцовак для адпачынку, псаванне дарожных знакаў і г.д. Няўжо і гэта — не справа міліцыі?

— Анатоль Іванавіч, у заключэнне мы скажам, што, пабываўшы на некаторых вашых аб'ектах разам з намеснікам галоўнага інжынера Уладзімірам Якаўлевічам Савіцкім і начальнікам аддзела падрыхтоўкі вытворчасці Паўлам Паўлавічам Скрабуновым, мы ўсюды бачылі стваральную працу персаналу. Не сумняваемся, што і ў далейшым вы возьмеце яшчэ не адну вышыню. Жадаем вашаму калектыву добрага здароўя, новых поспехаў у працы.

**— Дзякуй.**

**Алена ДАЎЖАНОК, В. БОЙКА,**
**Аляксей СУПРУН (фота).**



Начальнік аддзела падрыхтоўкі вытворчасці СКРАБУНОЎ Павел Паўлавіч на рэканструкцыі ўчастка дарогі М-4 Мінск—Магілёў.



Укладка дарожнага палатна на трасе М-5 Мінск—Гомель.



Вядучы інжынер па маставых збудаваннях ПАДАЙКА Марына Паўлаўна.



Укладка дарожнага палатна на трасе М-5 Мінск—Гомель (участак 101–106).



На дарозе М-4 Мінск—Магілёў ідуць работы па ўкладцы асновы дарожнага палатна.



Будаўніцтва новага моста праз раку Сож у раёне г. Крычава (дэмантаж фермаў старога моста).



На ўстаноўцы па вытворчасці бітумных эмульсій: майстар ПУЗЯНКОЎ Дзмітрый Рыгоравіч і аператар СВІРЫД Яўген Барысавіч.

**РУП «Магілёўаўтадар»**
г. Магілёў,
вул. Першамайская, 18
Тэлефоны:
+375 (222) 311 827;
+375 (222) 311 373;
+375 (222) 223 318.
УНН 700437908.



Інжынер-лабарант лабараторыі УТН АВЕРКІНА Надзея Васільеўна.



Інжынер-лабарант ШЛАПАКОВА Іна Ігараўна правярае бітумную эмульсію на вязкасць.



Інжынер дыспетчарскай службы БАШАРЫМАВА Галіна Віктараўна.



Начальнік аддзела механізацыі і энергетыкі ДЗЮБАНАЎ Уладзімір Міхайлавіч і вядучы інжынер ГАЛАВІН Уладзімір Іванавіч абмяркоўваюць планы мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да зімы.

# ЦЭНЫ НА ІНТЭРНЭТ У БЕЛАРУСІ ДАСЯГНУЛІ СВАЁЙ НІЖНЯЙ ПЛАНКІ

**Пра гэта паведаміў намеснік генеральнага дырэктара «Белтэлекама» Андрэй Собараў. Зараз неабходна працаваць над павелічэннем хуткасці доступу. Самыя амбіцыйныя планы прадугледжваюць давядзенне яе да 1 Гбіт/с. Зразумела, што спатрэбіцца новае абсталяванне, бо існуючае не зможа забяспечыць такой хуткасці.**

У сваю чаргу генеральны дырэктар УП «Надзейныя праграмы» Юрый Зісер лічыць беларусаў негаваркімі ў інтэрнэт-прасторы.

Каб выправіць сітуацыю і папулярызаваць інтэрнэт і яго прымяненне ў бізнэсе, адукацыі і дзяржаўным кіраванні, беларускі інтэрнэт-партал TUT.BY і «Белтэлекам» у пяты раз праводзяць штогадовую канферэнцыю «Дзелавы інтэрнэт». Сёлета яна адбудзецца 14-15 кастрычніка пад Мінскам. Цікава, што ў 2006 годзе падчас правядзення першай канферэнцыі, удзел у якой узяло амаль 300 чалавек, у Беларусі ўпершыню быў прыменены бесправадны спосаб доступу ў інтэрнэт у публічным месцы. Летась колькасць удзельнікаў перавысіла паўтары тысячы. Сёлета чакаецца не менш.

**Ірына ТАМКОВІЧ.**



Студэнткі 4-га курса Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Дар'я ГАРДЗЕЕНКА і Паліна ЛЕТУНОВА.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

На свае вочы

# «ТРЭБА ЗАРЭГІСТРАВАЦЦА. А ЧЫСТАЯ ВАДА БУДЗЕ ЗАЎТРА...»

## Падумаеш, якія дробязі для «Бліскучага Санкт-Пецярбурга»...

**Паўночная сталіца Расійскай Федэрацыі сустракае вялізнай колькасцю прыдарожных рэкламных шчытоў, на адным з якіх Пётр 1 і... галоўны трэнер піцерскага «Зеніта» італьянец Лучана Спалеці, з заклікам да жыхароў горада быць «адной камандай». Што гэта азначае, калі размова не толькі пра футбол? Нам, гасцям аднаго з буйнейшых мегаполісаў Еўропы, за тры дні тура «Бліскучы Санкт-Пецярбург» гэтага, вядома ж, не зразумець. Ды і мэты ў турыстаў іншыя — не «грузіцца» нейкімі праблемамі, а ўзбагаціцца ўражаннямі хоць бы пра частку славутасцяў горада на Няве.**

Спачатку — пра апошняе. Зусім коратка, паколькі хапае і адпаведнай літаратуры, і звестак у сусветнай павуціне. Ды і нішто не замяніць асабістыя ўражанні. Таму, калі ёсць магчымасць пабываць у Санкт-Пецярбургу, абавязкова ёй скарыстайцеся.

